«Наваполацкая літаратурная азбука» – кніга пра малую радзіму

В. І. Крук,
загадчык бібліятэкі БШ № 10 г. Наваполацка
Т. В. Калінічэнка,
бібліятэкар БШ № 10 г. Наваполацка

«Маленечкі кавалачак планеты, там, дзе бруіцца сіняя Дзвіна». Так трапна напісаў Валянцін Лукша пра Полацк. А побач са старажытнейшым горадам Беларусі на той жа сіняй Дзвіне знаходзіцца адзін з самых маладых і прыгожых гарадоў нашай краіны – Наваполацк. Для адных ён месца нараджэння і жыцця, для іншых – месца працы ці вучобы. Наш горад вядомы перш за ўсё сваімі нафтахімічнымі гігантамі. А хто з літаратараў меў ці мае дачыненне да Наваполацка? Якія творы напісаны імі пра горад і для дзяцей? Ці гучыць у горадзе беларуская мова і ці друкуюцца кнігі на ёй? На гэтыя і іншыя пытанні адказвае «Наваполацкая літаратурная азбука» – невялікая кніга, якая зусім нядаўна выйшла з друку. А задума яе стварэння ўзнікла ў бібліятэцы базавай школы № 10. За аснову ўзяты беларускі алфавіт. Спалучэнне літар «дз» і «дж», ці так званыя афрыкаты, уключаны ў «Азбуку» згодна агульнай практыкі. Выданне змяшчае звесткі пра літаратараў, якія маюць непасрэднае дачыненне да Наваполацка і Полаччыны. Хто яны? Гэта Уладзімір Арлоў і Ірына Жарнасек, Навум Гальпяровіч і Аляксей Дудараў, Сяргей Панізьнік і Сяржук Сокалаў-Воюш, Надзея Салодкая і Тамара Талкачова, Лявон Баршчэўскі і Аляксандр Мартыненка. А таксама Пятрусь Броўка і Янка Журба, Рыгор Барадулін і Генадзь Бураўкін, Валянцін Лукша і Валерый Старынскі. Не забыліся і пра гонар зямлі Полацкай – Еўфрасінню Полацкую і Францыска Скарыну. Не забыты і Тарас Хадкевіч, які напісаў самы буйны празаічны твор пра будаўніцтва Наваполацка – раман «Песня Дзвіны». Для многіх стане адкрыццём той факт, што класік беларускай літаратуры Янка Купала мае непасрэднае дачыненне да нашага горада. На будынку чыгуначнага вакзала ў Баравусе-1, якая зараз уваходзіць у склад Наваполацка, размешчана мемарыяльная шыльда з надпісам «Тут у 1916 г. служыў старшым рабочым дарожна-будаўнічага атрада Варшаўскай акругі шляхоў зносін беларускі паэт Янка Купала».

Вадзім Дзевятоўскі, ураджэнец Наваполацка і яго Ганаровы грамадзянін, добра вядомы ў Беларусі як спартсмен, чэмпіён свету, прызёр Алімпійскіх гульняў, старшыня Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі, былы дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. «Вясёлка прыгожая, дзень цудоўны, сонейка цёплае радасць дае! Наша жыццё, ты такое чароўнае! Шчасце быць часткай цябе!» Гэтыя светлыя, добрыя, поўныя аптымізму радкі напісаў Вадзім Анатольевіч.

З кнігі чытачы даведаюцца і пра народны тэатр лялек «КапялюШ», які працуе пры Цэнтры рамёстваў і традыцыйнай культуры Наваполацка, пра яго стваральніка і кіраўніка, пераможцу рэспубліканскага конкурсу «Чалавек года ў галіне культуры-2018» Андрэя Рэцікава.

Выданне не прэтэндуе на адлюстраванне ўсяго літаратурнага працэсу, але многія мясцовыя творцы, якія пішуць для дзяцей па-беларуску, трапілі на старонкі «Азбукі». Гэта Ганна Алескерава і Марыя Валькоўская, Іна Мароз і Ала Іванова, Рэгіна Шабанава і Кацярына Марчанка, Феакціст Фядотаў і літаратурна-музычнае аб’яднанне «Крылы». Шкада, што гэтую кнігу ўжо ніколі не патрымаюць у руках Юрась Касцюк і Пётр Магер. І як запавет навапалачанам гучаць радкі з верша былога загадчыка бібліятэкі нашай школы Лідзіі Полазавай:

Куды б не паехаў,
Далёка ці блізка,
Якія б не зведаў
Жыцця віражы,
Ты пакланіся гораду нізка!
Ты Наваполацкам даражы!

Пры падрыхтоўцы выдання выкарыстоўваліся краязнаўчыя матэрыялы гарадскіх і прыватных бібліятэк, інтэрнет-рэсурсы. «Азбука» змяшчае біяграфічныя звесткі пра літаратараў, іх творы, або ўрыўкі з твораў на беларускай мове. Кніга добра ілюстравана, мае выдатнае паліграфічнае афармленне. Заслуга ў гэтым мясцовага выдаўца Алега Маладзечкіна. Выданне стала магчымым дзякуючы спонсару, які ахвяраваў уласныя грошы і пажадаў застацца невядомым. Гэта сведчыць аб тым, што ёсць сярод нас людзі не толькі таленавітыя, але шчодрыя і сціплыя.

Выданне адрасавана вучням пачатковай школы, настаўнікам, бібліятэкарам, краязнаўцам, шырокаму колу чытачоў. Яно мае метадычнае значэнне. Пры жаданні кожны зможа стварыць аналагічную літаратурную азбуку пра «свой маленечкі кавалачак планеты».

ДУА «Базавая школа № 10 г. Наваполацка»

«... Маленечкі кавалачак планеты
Там,
Дзе бруіцца сіняя Дзвіна...»

НАВАПОЛАЦКАЯ

літаратурная АЗБУКА

2020 год

УДК
ББК

Складальнікі:
Таццяна Калінічэнка
Валянціна Крук

Выданне змяшчае звесткі пра літаратараў, якія маюць непасрэднае дачыненне да Наваполацка і Полаччыны, іх творы або ўрыўкі з твораў на беларускай мове.

Выданне не прэтэндуе на адлюстраванне ўсяго мясцовага літаратурнага працэсу.

Пры падрыхтоўцы выкарыстоўваліся краязнаўчыя матэрыялы гарадскіх і прыватных бібліятэк, інтэрнет-рэсурсы.

Матэрыял размешчаны ў алфавітным парадку.

Спалучэнні літар «дж», «дз» уключаны ў «Азбуку» згодна агульнай практыкі.

Выданне названа радкамі з верша Валянціна Лукшы «Гэтым трэба даражыць».

Адрасавана вучням пачатковай школы, настаўнікам, бібліятэкарам, краязнаўцам і шырокаму колу чытачоў.

ISBN

А Б В Г Д
Дз Дж Е Ё Ж З І
Й К Л М Н О П Р
С Т У Ў Ф Х Ц Ч
Ш Ы Ь Э Ю Я

Арлоў Уладзімір

Гісторык, пісьменнік, аўтар больш 30 кніг.

Нарадзіўся 25 жніўня 1953 года ў Полацку.

З 1975 па 1986 гады жыў у Наваполацку, працаваў настаўнікам гісторыі ў школе №3, у рэдакцыі газеты «Хімік». Жыве ў Мінску.



Бібліятэка базавай школы №10

У бібліятэчным фондзе налічваецца 17493 экзэмпляры падручнікаў і 8881 экзэмпляр літаратуры.

Загодбібліятэкаабслугоўваекаля800 чытачоў, выдае ім прыкладна 9000 экзэмпляраў кніг і часопісаў. Штогод рэгіструецца каля 10 000 наведванняў. Пры бібліятэцы працуюць клуб «Узрост шчасця» для педагогаў ва ўзросце 50+ і ветэранаў школы, а таксама літаратурны гурток «Сустрэча» для вучняў 4-х класаў.

Валькоўская Марыя

Працуе настаўнікам нямецкай мовы ў базавай школе № 10 г. Наваполацка. Піша вершы на беларускай, рускай і нямецкай мовах. Займаецца перакладамі.

Аўтар паэтычнага зборніка «Грани».

Ля Лукамор'я дуб зялёны.
Вісіць на ім ланцут штогод.
І днем, і ноччу шпацыруе
Па ланцуту вучоны кот.

Направа пойдзе – заспявае.
Налева — казку завядзе.
Там цуды ёсць: лясун блукае,
Русалка вабіць да сябе.

На невядомых на сцяжынках
Сляды нябачаных жывёл.
І хапка на нагах пушыных —
Няма дзвярэй, няма акон.

Пераклад урыўка з паэмы А.Пушкіна «Руслан і Людзміла»

Гальпяровіч Навум

Паэт, публіцыст, журналіст.

Нарадзіўся 14 студзеня 1948 года ў Полацку. Пасля заканчэння школы працаваў на полацкім шклозаводзе, у полацкай газеце «Сцяг камунізму».

У 1979 годзе скончыў Віцебскі педага-гічны інстытут. З 1977 года па 1996 год працаваў у Наваполацку.

Аўтар шматлікіх кніг паэзіі. На яго вершы напісаны песні беларускімі кампазітарамі.

Жыве ў Мінску.

Белыя фарбы зімы
Выткуць на вокнах карункі.
Любага краю малюнкі
Носім у памяці мы.

Гэтым змагацца і жыць,
Думаць і плакаць начамі,
Бо да апошняй мяжы
Мы назаўжды палачане.

Урывак верша «Белыя фарбы зімы…»

Лудараў Аляксей

Драматург, сцэнарыст.

Нарадзіўся ў 1950 годзе ў Дубровенскім раёне.

Скончыў Наваполацкае прафесійна-тэхнічнае вучылішча нафтавікоў у 1968 годзе. Працаваў у Наваполацку да 1972 года.

У 1976 годзе скончыў тэатральны факультэт Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута. Па яго творах пастаўлена шмат спектакляў, зняты фільмы. Жыве ў Мінску.

Сінявочка
Казка (Урывак)

У ціхай лагчыне, пад старой разгалістай вярбой жыла маленькая чыстая крынічка. Яе звалі Сінявочка. Крыштальная вадзіца ўдзень і ўночы, улетку і ўзімку бруілася з Сінявочкі, бы нітачка-ручаінка, і збягала ў Зялёную Сажалку, што жыла па суседству.

У спякотныя летнія дні ў крынічцы купалася Сонейка, ноччу на паверхні вады разам з зорачкамі адпачываў вастраногі Месяц. Сінявочка была вельмі добрая, яна з усімі сябравала, і кожны, хто толькі захоча, мог падысці і напіцца яе срэбнай халоднай вадзіцы… За гэта ўсе птушкі і звяры, што жылі ў лагчыне, любілі Сінявочку. І яшчэ яе любілі за тое, што ў начны супакой сваім звонкім голасам крынічка спявала песні…

Лзевятоўскі Вадзім

Вясёлка прыгожая,
Дзень цудоўны,
Сонейка цёплае
Радасць дае!

Наша жыццё,
Ты такое чароўнае!
Шчасце быць
Часткай цябе!



Нарадзіўся 20 сакавіка 1977 года ў Наваполацку. Скончыў сярэднюю школу № 9, Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт (юрыдычны факультэт).

Кідальнік молата, чэмпіён свету, прызёр Алімпійскіх гульняў і чэмпіянату свету. Заслужаны майстар спорту.

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь з 2012 па 2019 гады. З 2014 года — старшыня Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі. З 2009 года старшыня Наваполацкай арганізацыі рэспубліканскага аб'яднання «Белая Русь». Ганаровы грамадзянін Наваполацка. Піша вершы. Жыве ў Мінску.

Лж

Аляксандр Мартыненка нарадзіўся ў 1939 годзе ва Украіне. Вайсковец, служыў у танкавым палку ў Полацку. Пасля звальнення з арміі застаўся жыць у Наваполацку. Піша вершы на беларускай, рускай і ўкраінскай мовах.

Светлы горад над Дзвіной,
Быццам казка маладая,
Быццам птушаня над краем,
Над Радзімаю сваёй.
Як мелодыя жыцця,
Як народжаная песня,
Як гісторыі працяг
І як будучыні веснік.

Навум Гальпяровіч

Дажджы

Ідуць дажджы, яны на нас падобныя,
Усе такія невымоўна розныя:
У гэтага хада драбнютка-дробная,
У іншага — упэўнена-сур'ёзная.
Адзін ідзе — ваколле смехам поўніцца,
Другі вясёлкай шчыра пасміхаецца,
А трэці прыйдзе — стане за ваколіцай,
Нібыта век журбой стаяць збіраецца.
Ідуць дажджы… Скупыя і патопныя,
Вясёлыя, даверлівыя, грозныя…
Ідуць дажджы, яны на нас падобныя:
Неспадзяваныя, імклівыя, сур'ёзныя.

Аляксандр Мартыненка

Еўфрасіння Полацкая



Святая полацкай зямлі,
Асветніца часоў далёкіх,
Якія ў нябыт сплылі,
Шляхоў ты не шукала лёгкіх.

Аберагаеш ты наш край
І ад пакут, і ад няшчасцяў.
І мове спадчыннай не дай
Ты ад бяспамяцтва прапасці.

Каб з верай мы ішлі далей
У новы дзень, у час няспынны,
Гары для нас яшчэ ярчэй,
Святая зорка Еўфрасінні.

Урывак з верша Іны Мароз «Святая Полацкай зямлі». Аўтар жыве ў Наваполацку.

Святая Еўфрасіння — дачка Полацкага князя Святаслава, унучка Усяслава Чарадзея. У 12 год стала манахіняй. Жыла ў келлі Сафійскага сабора, перапісвала кнігі, вяла міратворчую і асветніцкую дзейнасць. Па яе замове дойлід Іаан у XII стагоддзі пабудаваў храм Спаса, які захаваўся да нашых дзён. А полацкі майстар Лазар Богша стварыў знакаміты Крыж — нацыянальную Святыню Беларусі.

Бн назваў Наваполацк «Грандыёзным помнікам людзям 60-х гадоў».

Зямля Беларусі! Бары і дубровы,
Жытнёвае поле, шаўковы мурог,
У промнях рабіны заход вечаровы,
Што клёкат буслоў — ручаёў перамовы
І ў шумных прысадах істужкі дарог.
Зямля Беларусі! Вачамі азёраў
Глядзіш ты ў празрыстыя выслі нябёс,
Начамі, што яблукі, падаюць зоры,
Знікаюць па водах, па чорных разорах,
Па травах, абсыпаных кроплямі рос.

Урывак з паэмы «Беларусь»

Мой родны край!
Як ты прыгож!
Ну што магу сказаць я больш.
Лясы наддзвінскія, лясы!
Не знаю большае красы,
Як ваш убор і гонкі стан,
Як ваш зялёны акіян!

Урывак з паэмы «Лясы наддзвінскія»

Гэтыя словы належаць Народнаму паэту Беларусі Петрусю Броўку.

Пятрусь Броўка нарадзіўся на Ушаччыне ў 1905 годзе. З 1925 года працаваў у Полацку.

Першы верш з'явіўся ў газеце «Чырвоная Полаччына». Народны паэт Беларусі, Акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук, Герой сацыялістычнай працы, лаўрэат шматлікіх прэмій.

Карнасек Ірына

Скрыпка і бубен
Казка (Урывак)

Гэта гісторыя здарылася ў Краіне Добрага Сэрца. Так-так, была калісьці на свеце гэткая краіна. І называлася так яна таму, што жылі ў ёй надзвычай добрыя людзі. Яны ніколі не крыўдзілі адзін аднаго, але імкнуліся рабіць толькі прыемнае. Жыхары тае краіны не кваліліся на чужое і жылі ў згодзе з суседзямі. На тварах людзей часта можна было ўбачыць вясёлыя ўсмешкі. А яшчэ яны вызначаліся тым, што вельмі любілі музыку і прыгожа спявалі.

Вучыў іх спяваць стары скрыпач Багуслаў…

Нарадзілася 17 студзеня 1953 года на Глыбоччыне.

Скончыла Мінскі інстытут культуры. У Наваполацку працавала ў бібліятэцы, у сродках масавай інфармацыі. Піша прозу, вершы, публіцыстыку, перакладае з польскай мовы. Аўтар шматлікіх кніг. Жыве ў Наваполацку.

Зімой у лесе

Народны паэт Беларусі Янка Купала (Іван Дамінікавіч Луцэвіч) нарадзіўся 7 ліпеня 1882 года на Міншчыне.

Першы верш «Мужык» быў надрукаваны ў 1905 годзе. Аўтар шматлікіх кніг для дарослых і дзяцей. Мае шмат узнагарод.

Янка Купала мае дачыненне і да нашага горада. У 1916 годзе ён жыў і працаваў у Баравусе-1. На будынку чыгуначнага вакзала ўстаноўлена мемарыяльная дошка з адпаведным надпісам.

Памёр 28 чэрвеня 1942 г. Пахаваны на Вайсковых могілках у Мінску.

І лягла ж цішына
У бары за гарой, –
Каб дравінка адна
Хоць кіўнула сабой.

Снег пушаны залёг
На галінах сасон,
І чарнобель, і мох
Атуліў сабой ён.

Сокат птушак замёр,
Як бы поўнач была,
Адно свісне тапор
Ды зазвоне піла.

Гэта сілу сваю
Так прабуе мужык;
Рухнуў дуб на зямлю,
Як магуч і вялік...

Далей — глуш, цішына
У бары, за гарой, —
Каб дравінка адна
Хоць кіўнула сабой.



Іванова Ала

Нарадзілася ў 1945 годзе ў вёсцы Цвеціна Міёрскага раёна. У 1965 годзе скончыла Полацкае медвучылішча па спецыяльнасці фельчар. Друкавалася ў рэспубліканскіх і мясцовых перыядычных выданнях, у зборніках і альманахах літаб'яднання «Наддзвінне». Жыве ў Наваполацку.

Пачатак вясны

Зіма здавалася бясконцай
І не хацела адступаць,
Зямлю ў абдымкі промняў сонца
Так не хацела адпускаць.

Ды ўжо журчыць з-пад тоўшчы лёду
Імклівы, жвавы ручаёк.
Спазнаўшы волі асалоду,
Бяжыць па схіле ён наўцёк.

А каб магла зямля напіцца,
Каб зеляней вясёлы гай,
Нясе жывую ён вадзіцу.
Вясну страчае небакрай.

Яна, красуня, кліч пачула,
Бо ўжо была не за гарой,
Зямліцу сонную кранула
Сваёю цёплаю рукой.

А па лачынцы, што на ўзлеску,
У зацішшы вольхаў і ракіт,
Хтось сыпануў ужо пралесак,
З нябёсаў тырснуўшы блакіт.

Ян

У вопратцы белаЙ
ШырокаЙ, даўгоЙ,
З вялікаЙ пушыстаЙ
МятлоЙ-барадоЙ
ПрыЙшоў к нам здалёку
Дзядуля-Мароз,
Завеі і холад
З сабою прынёс.

Янка Журба

Янка Журба нарадзіўся 30 красавіка 1881 года на Віцебшчыне. Меў педагагічную адукацыю.

Працаваў на розных пасадах. Апошнія гады жыцця правёў у Полацку.

Аўтар шматлікіх твораў для дзяцей.

Народны паэт Беларусі Рыгор Барадулін нарадзіўся на Упаччыне 24 лютага 1935 года.

Скончыў філалагічны факультэт БДУ. Першыя вершы былі надрукаваны ў 1953 годзе. Шмат пісаў для дзяцей. Продкі Рыгора Барадуліна жылі ў Полацку.



Грышка, Мішка
і ШчыпаЙ
Ехалі на чоўне.
Ды на цёмны
Вір круты
Човен раптам
Наляцеў.

Грышка
З чоўна паляцеў,
Мішка ўслед
У вір — чабох.
Хто застацца ў чоўне змог?
(Цішына)

Рыгор Барадулін

Касцюк Юрась

Нарадзіўся 6 мая 1943 года на Глыбоччыне. Закончыўшы школу, паступіў на мастацка-графічны факультэт Віцебскага педінстытута, але не скончыў яго. Пасля службы ў арміі паступіў на завочнае аддзяленне журфака БДУ. Працаваў на будоўлі Нафтаграда, у гарадскіх газетах Полацка і Наваполацка. Займаў адказныя пасады. Але заўсёды пісаў вершы, апавяданні, замалёўкі, абразкі.

Друкавацца пачаў яшчэ ў школе. Яго творы публікаваліся ў розных перыядычных выданнях.

Наваполацку

Мяне сталіцы шумныя не вабяць,
Да віру іх не прыстасован я,
А тут цагліна кожная ў памяць
Умурована часцінкаю жыцця.

Тут мной калона кожная ўзнята,
Пастаўлена трывала, на вякі,
А мне і сёння спраў багата —
Я з тых, імя калу будаўнікі.

Лукша Валянцін

Паэт, празаік, публіцыст, драматург, перакладчык. Аўтар кніг паэзіі для дарослых, сборнікаў вершаў і казак для дзяцей, п'ес, тэкстаў папулярных песень, публіцыстыкі.

Нарадзіўся 16 лістапада 1937 года у Полацку. Працаваў у Наваполацку ў будаўнічым трэсце № 16.

Адданы мы зямлі сваёй адзінай.
Яна для нас —
І клятва,
І статут.
З усіх святынь няма вышэй
Радзімы,
Цяплей кутка няма,
Чым родны кут.

Усё з Лічынай сэрцам знітавана
На доўгі век,
Як берагі з ракой:
І радасць стрэч,
І боль пякучай раны,
І горыч страт,
І творчы неспакой.

...Маленечкі кавалачак планеты
Там,
Дзе бруіцца сіняя Дзвіна.
Тваім дыханнем сонечным сагрэты.
Ты для мяне —
Жаданая вясна.

Урывак з верша «Гэтым трэба даражыць»

Магер Пётр

Нарадзіўся 24 жніўня 1951 года ў Полацку. Скончыў Наваполацкую музычную школу і Наваполацкае музычнае вучылішча. Працаваў настаўнікам музыкі па класу баяна.

У 1981 годзе скончыў музычна-педагагічны факультэт Мінскага педінстытута імя М. Горкага, працаваў выкладчыкам музыкі і спеваў у Полацкім педвучылішчы.

Пісаў вершы. Друкаваўся ў мясцовых газетах і зборніках. Выдадзена некалькі аўтарскіх паэтычных зборнікаў.

Экскурсія

У сядзібу Пушкіна на госці –
Пад дубам еду пасядзець.
Мо ўбачу новае там штосьці,
Пачую кот пра што пяець.

Імкнуцца людзі да паэта,
Што вершы дзіўныя пісаў.
Нарэшце споўнілася мэта –
І я ў сядзібу завітаў.

Гучаць радкі паэта гулка
Паміж лугоў, лясоў і гор.
Мясціны дзіўныя: рачулка,
Люстэркі казачных азёр.

Не чутна блізкай аўтастрады,
Лясы сасновыя шумяць.
Да прыгажосці гэткай рады
І я прычаснасць адчуваць.

Наваполацк

З 2002 года пры Наваполацкай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэме працуе народнае літаратурна-музычнае аб'яднанне «Крылы».

Заснавальнік і кіраўнік Галіна Сташкевіч.

Наваполацкія літаратары прысвяцілі любімаму гораду свае вершы.

Урыўкі з вершаў

Майму гораду

Наўзбег спяшаеш па жыцці
З усмешкаю бяспечнай!
Мой Наваполацк, шапаці
Дзвіною цумнацечнай!

Людміла Мяхедка

Каля першай палаткі

Каля першай палаткі святочныя крокі:
Добрай феяй па горадзе крочыць вясна.
А над вуліцай Паркавай стужкай шырокай
У блакіт далягляда ўзлялася Дзвіна.

Валянціна Аколава

Бурштын Прыдзвіння

Разгарнуўся блакіт небасхіла,
Вербы сніпла размовы вядуць.
І Сафія раскінула крылы,
Каб у люстра Дзвіны зазірнуць.

Міхаіл Зудзілаў

Ой

Упершыню верш быў надрукаваны ў 1926 годзе ў газеце «Чырвоная Полаччына».

Ой, не шапчы, мая бярозка,
Журлівым пошатам галінаў,
Пайду сягоння ў поле позна —
Сустрэну любую дзяўчыну.

Сустрэну ў полі, дзе бярозкі,
У вечар росны,
Вечар мглісты,
І будуць нець зялёным лістам
У полі белыя бярозкі.

Чуць свет, чуць сонейка ўстане,
Пайду з касой на луг мурожны.
Трава квяцістая, густая
Будзе губляць сваю прыгожасць.

А сонца яркае ўстане —
Трава завяне ў пракосах,
І я пайду па лузе босым,
Хай з сонцам сэрцайка спявае.

Дык не шапчы, мая бярозка,
У ліпнёвы вечар мне не сумна —
Вітаю свету новы росквіт
І Беларусь, маю красуню!

Пятрусь Броўка

Полазава Лідзія

Нарадзілася ў 1956 годзе на Ушаччыне. Скончыла Мінскі інстытут культуры па спецыяльнасці бібліятэкар-бібліёграф. Жыла і працавала ў Наваполацку.

З 1985 года па 2003 год працавала загадчыкам бібліятэкі школы № 10. З 2003 года ўзначальвала сектар мастацтваў Цэнтральнай бібліятэкі імя У. Маякоўскага. Пісала вершы, друкавалася ў альманахах, зборніках, газетах.

Ты Наваполацкам даражы!

З працай абвенчаны
Горад мой родны.
Авеяны славай
Яго рубяжы.
Дзвінскія хвалі
Ласкава спяваюць:
– Ты Наваполацкам даражы!
Славу бацькоў мы
Памножым з табою.
Светлыя мары — не
міражы.
Справы — святыя,
Мы — маладыя.
– Ты Наваполацкам даражы!
Колькі шчаслівых
Пражыта тут лёсаў…
Наша каханне
І ты зберажы.
Колькі ўжо вёсен
Удалеч мы крочым…

– Ты Наваполацкам даражы!
Куды б ні паехаў,
Далёка ці блізка,
Якія б не зведаў
Жыцця віражы,
Ты пакланіся гораду нізка!
– Ты Наваполацкам даражы!

Радзіма

Зямля бацькоў *Урывак*

Квітней, Радзімы дзіўная старонка!
Лагодай шчодрай поўніся, Зямля!
Гарыць рабіны казачная гронка,
Табе пяю, Бацькоўшчына мая.
Зямля бацькоў, дзе клёкат жураўліны,
Сяброў частуе хлебны каравай,
Бурліць дзівосны кіпень журавіны.
Квітней Радзіма, велічны мой край!

Кацярына Марчанка
Аўтар жыве ў Баравусе-1

Застанецца песня і Радзіма.
Можна ўсё прайсці, але яны
Лёс напоўняць сілаю адзінай,
Што ад хваляў полацкай Дзвіны.
Толькі гэта будзе не часова,
І заўжды ў тваёй душы жыве
Ціхае на роднай мове слова,
Месячная сцежка на траве.
Будзе гэта адчуванне песніць
І крылата ў неба паляціць.
Ёсць Радзіма — значыць, будзе песня.
Будзе песня — і Радзіме жыць.

Навум Гальпяровіч

Старынскі Валерый

Мой горад, магутны твой голас
Гучыць, як паводкі разліў,
Табе я нясу, Наваполак,
Пашану ад роднай зямлі.

Родная мова — матуліна слова,
Хвалі азёрны разліў.
Шэпат чаромхі ў час вечаровы,
Сонца аблашчаных ніў.
Родная мова — ты сонца і дзіва,
Сэрца ласкавы ўзлёт:
Мама, каханне, жыццё і Радзіма,
Мой беларускі народ!

Урывак з верша «Родная мова»

Нарадзіўся 18 мая 1940 года на Верхнядзвіншчыне. У 1959 годзе скончыў Друйскае тэхнічнае вучылішча.

З 1959 года па 1964 год працаваў на будаўніцтве нафтаперапрацоўчага завода, «Паліміра» і на розных аб'ектах Наваполацка і Полацка. У 1969 годзе закончыў Беларускі політэхнічны інстытут, тэатральную студыю. Пісаў вершы, музыку на свае вершы. Быў актыўным удзельнікам мастацкай самадзейнасці.

Талкачова Тамара

Нарадзілася 13 лістапада 1937 года ў вёсцы Цялуша Бабруйскага раёна. Скончыла Мінскі педінстытут імя М. Горкага. Член Саюза пісьменнікаў з 2007 года. Яе вершы друкаваліся ў калектыўных зборніках і альманахах. Аўтар шматлікіх кніг.

Вершы Тамары Талкачоваў пакладзены на музыку вядомымі беларускімі кампазітарамі, выконваюцца вядучымі салістамі і калектывамі на самых прэстыжных канцэртных пляцоўках Беларусі. Жыве ў Наваполацку.

Наваполацку

Мой горад, дазволь мне табе пакланіцца,
Дазволь у любові прызнацца табе.
Калісьці, даўней, не магло і прысніцца,
Што я не змагу проста жыць без цябе.

Я ж дзякаваць лёсу свайму не стамлюся,
Што сцежка мая завярнула сюды,
Што я прыжылася тут і, спадзяюся,
Жыць тут буду доўга, да скону, заўжды.

І ў сюжы, мой горад, і ў сонечным леце
Дзялюся я шчасцем з табой і тугой.
Ты стаў для мяне наймілейшым у свеце,
Ты стаў маім домам, радзімай другой.

Табе, Наваполак, і слова, і песня,
І праца, і мараў імклівы ўзлёт!
Расправіўшы крылы, як птах напрадвесні,
Расці, прыгажэй, і красуй з году ў год!

Устаў удод уранні,

Прыбраў сваё дупло,
І твар памыў у ванне,
І кожнае крыло.

С. Сокалаў-Воюш

Сяржук Сокалаў-Воюш нарадзіўся ў вёсцы Астроўшчына Полацкага раёна 16 кастрычніка 1957 года. З 1973 года жыў у Наваполацку. Скончыў філалагічны факультэт БДУ. Працаваў настаўнікам у сярэдняй школе № 5 нашага горада. Першыя вершы былі надрукаваны ў наваполацкай газеце «Хімік» у 1973 годзе. Паэт, перакладчык, журналіст, музыкант.

Беларусь мая

Аксамітны летні вечар ахінуў зямлю,
Я вазёрную сінечу вуснамі лаўлю.
Моўчкі слухаю ў росах песню салаўя.
Над маім лунае лёсам Беларусь мая.

А над лесам, над сусветам выпрастаў крыло
Залацісты човен ветах, зорнае вясло.
Стан дзявочы Белай вежы, подых ручая,
Я адной табе належу, Беларусь мая!

Там, дзе гойдае вятрыска залаты мурог,
Паўставалі камяніскі ля тваіх дарог.
Чырванее ранні золак, рэха ў гаях,
А ў грудзях тваіх асколак, Беларусь мая.

Мне краёў чужых не трэба, як не варажы,
Не хачу чужога хлеба, радасцяў чужых,
Бо чужына сэрца джаліць, цісне, як змяя,
Бо гукае з дальніх даляў Беларусь мая.

С. Сокалаў-Воюш

У

У нескладовае з'яўляецца 22-ой літарай беларускага алфавіта. Такая літара існуе толькі ў беларускім алфавіце. Памятны знак гэтай літары ўстаноўлены ў Полацку на бульвары праспекта Францыска Скарыны.

Адкрыты ў верасні 2003 года ў час святкавання Дня беларускага пісьменства. Аўтар памятнага знака — беларускі мастак з Полацку Ігар Куржалаў.

Памятны знак адноўлены ў 2016 годзе.

Ён зроблены з бронзы ў выгладзе вокладкі кнігі, на якой змешчаны словы з літарай «Ў», а таксама цытата з верша Рыгора Барадуліна «Полацкі менталітэт»:

«Ад Еўфрасінні, ад Скарыны, ад Полацка пачаўся свет».

Ёсць полацкі менталітэт —
Ад Еўфрасінні, ад Скарыны,
Ад той абрынутай адрыны,
Дзе сон шукаў свой сонны след.
Ён цемры пазычаў святла,
Каб стала вечнасцю імгненне,
Ляцеў вышэй жаўрук здзіўлення,
Люцела рупнасці пчала.
Ад Полацка пачаўся свет.
Пра небачольх кажам:
З нашых!
Ёсць Беларусь,
А гэта значыць —
Ёсць полацкі менталітэт!

Фядотаў Феакціст

На маёй Радзіме — Беларусі
Зорачкі ў нябёсах давідна.
Тут Святланы, Юркі ды Марусі.
Тут валошкі, лён і збажына.

Тут у думках чыстых прага волі
І мае адвеку карані.
Што шукаць у свеце лепшай долі?
Тут яна, у кожным нашым дні!

Наваполак, ты найлепшы!
Для мяне ты самы першы,
Самы першы з гарадоў.
Тут прыдзвінскае світанне,
Тут я крочу на спатканне,
Тут падчас само каханне
Сыпле клёкатам буслоў.

Наваполак, ты найлепшы!
І не грэх, што маладзейшы,
Маладзейшы за братоў.
Тут затое ёсць прызнанне,
Ёсць і радасць, і спатканне,
І падчас само каханне
Сыпле клёкатам буслоў.

З верша «Наваполак, ты найлепшы!»

Нарадзіўся ў 1951 годзе на Глыбоччыне.

СкончыўМаскоўскіінстытут харчовай прамысловасці.

Працаваў у Мурманску.

Удзельнічаў у розных экспедыцыях ад Паўночнага Ледавітага акіяна да Паўднёвай Атлантыкі. Выдадзены дзве кнігі вершаў.

Хадкевіч Тарас

Празаік, паэт, перакладчык, публіцыст. Нарадзіўся 7 сакавіка 1912 года ў вёсцы Шайцерава Верхнядзвінскага раёна.

Вучыўся ў Полацкім педагагічным тэхнікуме. Працаваў у газетах.

У гады Вялікай Айчыннай вайны камандаваў узводам, быў паранены, трапіў у палон.

Аўтар шматлікіх кніг. Вынікам плённай творчай працы Тараса Хадкевіча стаў раман «Песня Дзвіны» пра будаўніцтва Наваполацка.

Ім напісаны творы для дзяцей: «Спеюць яблыкі», «Жыла-была казка», «За сінім лесам», «На новым месцы».



«Нізкі паклон табе, Заходняя Дзвіна, мая радзіма, калыска майго маленства, невычэрпная радасць маіх сталых год.

Я шмат блукаў па тваіх берагах, тваё хвалі не раз калыхалі мой човен і лёгкім плёскатам песцілі мой слых. Я пў з тваіх чыстых крыніц. Я ўглядаўся з тваіх круч у бяскрайнія далі, услухоўваўся ў шумлівы гоман лясоў і гаёў, упіваўся чэрвеньскай красой палёў і паплавоў. Шмат бачыў; бясконца слухаў казкі-былі даўняга і сённяшняга.

З кнігі «Песня Дзвіны»

Цукеркі

Ганна Аляскерава нарадзілася 27 студзеня 1956 года ў вёсцы Баркі Полацкага раёна. У школьныя гады любіла маляваць, спяваць, танцаваць. У восьмым класе пачала пісаць вершы на рускай і беларускай мовах. Пасля школы вучылася ў Полацкім швейным вучылішчы. Многія гады працавала з дзецьмі.

Напісала для дзяцей шмат цікавых вершаў, казак, песень, загадак. Друкавалася ў паэтычных зборніках «Крылья», «Вдохновение», «Зелёная лампа», на старонках мясцовых газет.

Жыве ў Наваполацку.

Тут стаялі дзве талеркі,
Там ляжалі дзве цукеркі.
Я пытаю ў Валеркі:
– Дзе падзеліся цукеркі?
– Гэтыя цукеркі
Скінулі паперкі
І праз гэты роцік
Трапілі ў жывоцік.

Скок з лісточка на сучок,
Пырх з былінкі на кусток.
Мільгачу я, быццам знічка.
(У мяне такая звычка.)
А завуць мяне …
(ніхіні)

Чарадзейныя словы



Сяргей Панізьнік — вядомы беларускі пісьменнік. Нарадзіўся 10 мая 1942 года на Міёршчыне.

Аўтар шэрагу зборнікаў вершаў, кніг публіцыстыкі і прозы. Шмат твораў прысвяціў Прыдзвінню. Быў частым госцем наваполацкіх літаратараў. Піша для дзяцей і моладзі. Сярод яго кніг — пяць пра маленства і юнацтва. Мае шчаслівы дар дзіцячага светаўспрымання, таму добра ведае, што цікава маладому пакаленню.

Свеціць сонца.
Бачу цень.
Прывітаўся:
– Добры дзень!..
Цень стаіць
І не хістаецца.
Цень са мною
Не вітаецца.

Я пайшоў —
І цень скрануўся.
Цень за дрэва
Захінуўся.
З кроны
Нейкі чараўнік
«Чык-чырык!»
Сказаў — і знік.

Цень знямелы
Дзіву даўся:
«Верабей,
А прывітаўся!»
Дабрадзеі тры
харобрыя:
Ранак, Дзень
І Вечар добрыя.

Хто вітае
Іх часцей, —
Той жыве,
Як чарадзей.
А хто ласкай
Грэе вочы, —
Яшчэ й зычыць:
– Добрай Ночы!

Шабанава Рэгіна

Нарадзілася 15 чэрвеня 1947 года на Верхнядзвінпчыне. Скончыла Віцебскі педагагічны інстытут. Мае адукацыю настаўніка чарчэння і малявання. Працавала ў розных школах Наваполацка, у тым ліку і ў нашай.

Друкавацца ў сродках масавай інфармацыі і калектыўных зборніках пачала з 2009 года.

Выдадзены тры аўтарскія зборнікі. Піша вершы і прозу на беларускай і рускай мовах.

Радзіма

Урывак

Усёй істотай імкнуся ў спелае поле,
На квяцісты лужок, дзе званочкі, дзе воля,
Дзе і неба ўверсе, як Божае вока…
Не падлічыш і ветразі белых аблокаў.

Пра бусла

Дзе той бусел даўнаногі,
Што таптаўся паўз дарогі?
Ён схаваўся ля балота:
Там цянёк, а тут спякота.

Як пачалі жыта жаці,
Тут як тут на сенажаці
Гэты бусел даўнаногі —
Зноў тапоча ўздоўж дарогі.

Ён шукае жабянятак —
Вельмі клопатны занятак,
Не прагулка, а работа:
Есці бусліку ахвота.

Ы

Падкасцельцы,
Васілеўцы,
Дручаны,
Пачтары,
Плаксы

На месцы гэтых і іншых вёсак пабудаваны наш горад Наваполацк. Будаўніцтва пачата 7 чэрвеня 1958 года. Побач з горадам узведзены вялікія заводы «Нафтан» і «ПаліміР».

Вуліца Маладзёжная — самая доўгая вуліца ў Беларусі.

Лявон Баршчэўскі нарадзіўся 4 сака-віка 1958 года ў Полацку. Скончыў Мінскі педагагічны інстытут замежных моў. Працаваў выкладчыкам у Наваполацкім політэхнічным інстытуце.

Пісьменнік, публіцыст, перакладчык.

Я па вуліцах шмат пахадзіў гарадскіх —
Нават назва ці ў памяці кожная?
Ды адна не растане ў згадках маіх:
Наваполацкая Маладзёжная.

Раніцой, калі ў чырвані сонца ўстае,
Між таполяў хадой асцярожнаю,
Баючыся збудзіць, я іду да яе —
Ды яна ўжо не спіць, Маладзёжная!

Крок раблю — бы чытаю пазму пра дні,
Дні руплівыя, часам трывожныя,
Як у працы, у сэрцах людскіх цеплыні
Паўставала яна — Маладзёжная!

Цеплыні гэтай схованка зараз — вось тут,
Дзе будынкі, дзе ўзбоччы мурожныя,
Дзе вірує заўжды жыццярадасны люд.
Гэта шчасце тваё, Маладзёжная.

Лявон Баршчэўскі

К

Францыск Скарына — стваральнік беларускага і ўсходнеславянскага кнігадрукавання, гуманіст і асветнік, адыграў рашаючую ролю ў развіцці культурнага жыцця нашага народа. Нарадзіўся ў Полацку каля 1490 года.

Яго можна лічыць прадзедам інтэрнэту: пятьсот гадоў таму скарынаўскія першадрукі таксама зрабілі інфармацыйную рэвалюцыю. Дзякуючы яго кнігам беларуская мова стала мовай першай у Еўропе Канстытуцыі — Статута Вялікага Княства Літоўскага.

З прадмовы да кнігі «Юдзіф»

Ад нараджэння звяры,
што ў чашчобах блукаюць, —
ведаюць ямы свае;
Птушкі, паветра свідруючы, —
гнёзды свае не губляюць;
Рыбы ў морах бурлівых —
чуюць свой вір без памылкі;
Пчолы і іншая жыўнасць —
вуллі бароняць заўжды.
Гэтак і людзі: дзе нарадзіла іх маці,
на шчасце ўскарміўшы, —
Ласку да месца таго
берагуць заўсягды!

Экскурсія

ў народны тэатр лялек «КапялюШ», які працуе пры Цэнтры раміствадў і традыцыйнай культуры Наваполацка. Тэатр існуе больш за 20 гадоў па двух накірунках: батлейка і тэатр лялек.

Лялечнік, філосаф, чарадзей, кіраўнік тэатра Андрэй Рэцікаў — пераможца рэспубліканскага конкурсу «Чалавек года ў галіне культуры — 2018».

Андрэю Рэцікаву ўдалося адрадзіць батлейку, якая існавала ў Віцебскай вобласці ў канцы XVIII – пачатку XIX стагоддзяў.

У тэатры шмат лялек, якія зроблены ўласнымі рукамі кіраўніка, розных памераў, з розных матэрыялаў.

Дзякуючы плённай працы майстра ў Наваполацку існуе адна з самых багатых у Беларусі калекцый батлеек.

У тэатры пастаўлены спектакль«Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі» па кнізе Пятра Васючэнкі, які нарадзіўся ў Полацку і напісаў шмат твораў для дзяцей.

Юнацтва Сінія Арэлі

Пісьменнік, сцэнарыст, перакладчык, грамадскі дзеяч Генадзь Бураўкін нарадзіўся 28 жніўня 1936 года на Расоншчыне.

Вучыўся ў Расонскай школе, потым у Полацку.

У 1959 годзе скончыў БДУ (аддзяленне журналістыкі). Працаваў карэспандэнтам у розных часопісах і газетах, на радыё. Займаў адказныя пасады, з 1990 па 1994 гады быў пастаянным прадстаўніком Беларусі ў ААН.

Лаўрэат шматлікіх прэмій.

Першы верш быў надрукаваны ў Полацкай газеце «Сцяг камунізму». Аўтар многіх кніг паэзіі, папулярных песень.

З асаблівай цеплынёй Генадзь Бураўкін піша пра родную Полаччыну.

Яны прыглушана рыпелі
Сярод старых стамлёных ліп.
Мы тыя сінія арэлі
Зламаць нікому не далі б.

Над імі гойдаліся далі,
Яны нам казкаю былі —
І ў неба сінія ўзляталі,
І ледзь краналіся зямлі.

І як бы мы не пастарэлі,
Няхай і летам, і зімой
Юнацтва сінія арэлі
Ляцяць між небам і зямлёй…



Я і слова

Надзея Салодкая нарадзілася 23 кастрычніка 1947 года ў вёсцы Шэркіна Лёзненага раёна.

Скончыла Полацкае медвучы-лішча. Працавала ў Полацку. Жыве ў Наваполацку. Піша вершы. Аўтар 14 кніг паэзіі. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Ганаровы грамадзянін г. Полацка. Лаўрэат шматлікіх прэмій.

Яе вершы паклалі на музыку вядомыя беларускія камазітары І. Капланаў, Л. Захлеўны, М. Яцкоў.

Хоць пішы не пішы — думкі цугам віруюць,
Немагчыма іх вымусіць роўненька стаць.
Зноў і зноў я ў ціцы над паперай чарую,
Каб прыхільнік мой некалі змог разгадаць,
Як спакойна пагляд і нязмушанасць слова
Прытуліліся сціпла краёчкам зімы,
Як старэнькі пашалак стаў шыкоўнай абновай,
Ды як дождж-залівень адзіноту размыў.
Я і слова… Прыгожае наша сумоўе…
Словы тыя няюць і гарэняць — жывуць!
Можа, гэта і страшна, ды шчодраю кроўю
Я радок паліваю, нібыта траву-мураву.